Ірына Клімковіч



...магчыма, этымалагічна назва Беларусь
тлумачыцца як «краіна балотаў»
ці «белая краіна», магчыма...

# Чортавае вока

"*...Напачатку было балота.*
. . . . . . . . . . . .
Пераходзілі эры,
сьвятло
пагасала,
і сутарэньні
нагрувашчваліся — было:
*першаіснасьць... першатварэньне...*"
Алесь Разанаў.

Балоты для Беларусі маюць сакральнае значэньне. На думку навукоўца і пісьменьніка Івана Чароты, прыродныя і геаграфічныя рэаліі, ня важна — раскіданыя яны, паасобку ці ў сукупнасьці, замацоўваюцца за пэўным народам, як знакі тэрыторыі і дзяржаўнасьці. Бо тыя рэаліі, як найбольш характэрныя для гэтай тэрыторыі, зьяўляюцца архетыпамі, стэрэатыпамі роднага кута, радзімы. Ёсьць жа "стэпавыя людзі", "горныя", "тундравыя"... А мы хто? Узгадайце школьную хрэстаматыю, Іван Мележ вызначыў трапна — "Людзі

на балоце". Вобраз балота займае цэнтральнае месца ва ўсіх жанрах беларускага фальклору і зьяўляецца адным са стрыжняў беларускай мадэлі сьвету.

Узгадайце народныя афарызмы: "На кожнае балота чорт знойдзецца"; "Калоціць, як чорт балота", "Сьвіньня ў балоце, як пан у залоце"; "Кожны кулік на сваім балоце вялік"... А нашыя моўна-магічныя творы — замовы: "Ідзіце вы, зглаз-урокі, на імхі, на балоты, на топкія аржаваньні, на ніцыя лозы, на гнілыя калоды..." (замова ад ліхога вока); "Пякота, пякота ехала цераз балота на сівой кабыле. Кабыла ўпала, пякота прапала" (ад пякоты); "Ступай у пні, у калоды, у гнілое балота (замова ад ліхаманкі)... Тут, дарэчы, вобраз балота адмоўны. А вось, да прыкладу, у прысушцы: "Як краснае сонейка зьзяе, прыпякае мхі і балоты, чорныя гразі, так і ты прыбягай, ка мне прысыхай...", тут ужо трошкі іншы погляд на балота. У вясельнай жа песьні: "Ой, выйду я за варота, зірну на балота... Й на тым балоце стада коней ходзіць..." — зусім іншае стаўленьне да нашай нацыянальнай ландшафтнай адметнасьці. Нават у загадках балота паўстае як мадэль сьвету: "Па мне паўгода ходзяць, паўгода езьдзяць" (Балота). Мяркую, фальклорных прыкладаў дастаткова. І прафесійныя літаратары не аднойчы зьвярталіся да балотнай тэмы. Прыклады можна знайсьці і ў Якуба Коласа, і ў Янкі Купалы, і ў Максіма Багдановіча...

У бальшыні славянскіх моваў словы "мох" і "балота" — сінонімы. Першае мае для ўсіх славянаў агульнае значэньне. Другое, на думку бальшыні філолагаў, паходзіць ад праславянскага *bolto*, славянскага *блато* і суадносіцца з літоўскім *baltas* (белы). "Balt" жа ў прускай мове першапачаткова азначаў адрэзаную, замкнёную частку мора, па прынцыпе — "белы" ці "балоцісты" (г.зн. нерухомыя воды). Прусы — адно са зьніклых балцкіх плямёнаў. Магчыма, сучасныя беларусы і суседнія нам балцкія народы маюць агульныя карані, і слова, якім продкі балтаў называлі замкнёную водную прастору, стала назвай нашай краіны — Беларусь. Магчыма, этымалагічна назва Беларусь тлумачыцца як «краіна балотаў» ці «белая краіна». Магчыма.

Мы ня дзівімся, што народы Крайняй Поўначы карыстаюцца неверагоднай колькасьцю словаў, якія ў іншых мовах перакладаюцца адным — "сьнег". Тое самае ў ірландцаў з назвамі вятроў, у іх дзясяткі найменьняў — яны ж мараходы, рыбакі. Арабы па-рознаму, залежна ад стану, называюць пясчаную паверхню пустэльні. А што беларусы? Мяркуйце самі. Вось колькі сінанімічных прыкладаў. А*лёс*: вільготнае месца; *белка:* нягразкае балота, якое зарасло травой; *бель*: невялікае балота, забалочанае нізкае месца; само слова *балота*: лес, часьцей забалочаны, нізкае месца, якое парасло тоўстым слоем моху, журавінамі, дурніцамі, бегуном; *балотца*: невялікае круглае балота; *балацьвінка*: маленькае сенажатнае балота на полі, у лесе, на лузе; *вярэцее*: нізкае і балоцістае, цяжкапраходнае месца. Шэраг можна доўжыць. Слова "балота" зьяўляецца агульным азначэньнем розных зьяваў — зьнешне падобных кавалкаў зямной паверхні. Яны і складаюць аснову беларускага ладшафту: балаты і лясы, лясы і балаты, яшчэ балаты ў лясах і лясы на балатах…

А вось непраходныя ўчасткі маюць жудасныя назвы: *дрыгва, трасіна, бездань, балацюга, валака, вігар, вішар, вязь, імшарына, твань, тапіла, топ, нетра*... Мясьціны, дзе звычайна гінулі людзі і жывёлы, дзе надараліся невытлумачальныя і дзіўныя выпадкі, палохалі і натхнялі беларусаў. Гэта спрыяла зьяўленьню легендаў, чарадзейных гісторыяў і павер'яў, зьвязаных з балотным сьветам.

Так узьнікла першааснова для міфапаэтычных уяўленьняў нашых продкаў.

Матыў пакланеньня балотам прасочваецца ад самых вытокаў чалавечага абстрактнага мысьленьня, з часоў, калі людзі толькі пачыналі асэнсоўваць акаляючую іх рэчаіснасьць, ацэньваць яе ў шматмернай прасторы сьвядомасьці. На антанімічных разуменьнях "добра-кепска", "карысна-шкодна", "бясьпечна-небясьпеч-

на" узьнікалі першыя высновы, рабіліся першыя спробы ахапіць навакольны сьвет суцэльным поглядам. Тады і нарадзіліся міфы. Старажытныя людзі пасялілі душу балота ў сівых, шапаткіх зарасьніках трысьнягу і чароту. Адбіткі халоднага блакітнага неба ў балотным вакне, так званым *чортавым воку*, зьменлівыя зморшчынкі на паверхні вады, замерзлая журавінка на сьнезе, ласіны сьлед, сталі для іх праявамі нябачнага жыцьця боствaў і духаў, увасобленых у такіх істотах як чорт, вадзянік, русалка…

Міфатворчасьць ляжыць у самой аснове чалавечага ўспрыманьня сьвету. Міфы — балансаваньне паміж пачуцьцём і розумам. Разьвіцьцё і сталеньне чалавечай сьвядомасьці дало падставы дзеля пераўвасабленьня міфаў у казкі, легенды і паданьні, абрады і звычаі. Аскепкі міфаў прыхаваны і ў сёньняшніх устойлівых словазлучэньнях, жывых прымхах.

Пакланеньне балотам ў старыя часы зьява заканамерная. Культ балота, пакланеньне яму, гэта і ёсьць культ вады – сімвалу ўрадлівасьці. Апроч балотаў людзі абагаўлялі як сімвалы ўрадлівасьці вазёры, крыніцы, студні, рэкі, іх вытокі...

Вада, поруч з Зямлёй, Паветрам і Агнём, у народных уяўленьнях адна з асноўных касьмічных стыхіяў. Шмат у якіх міфалогіях вада сімвалізуе Хаос, і ад яе бярэ пачатак стварэньне Сьвету. Згодна з беларускімі і балцкімі паданьнямі, зямля была створаная з пяску, узятага са дна першапачатковых водаў. У індаеўрапейскай і балтаславянскай міфалогіях вада падзяляецца на зямную і нябесную. У зямных водах хаваецца зьмей ці пазьнейшы за яго чорт. Дождж, як нябесная вада, насылаецца Грамавіком (Перуном), якога пазьней замяніў сьвяты Ільля. У шэрагу міфалогіяў гаспадаром зямных водаў (крыніцаў, азёраў, балотаў) зьяўляецца супраціўнік Грамавіка. У легендах асілак, які перамог зьмея, выпіў ваду з азёраў.

Возьмем, да прыкладу, індыйскія касмаганічныя міфы тварэньня. Яны даюць шматлікія варыянты тэмы першабытных водаў, па іх плаваў Нараяна, з пупа якога ўзьнялося сусьветнае дрэва. Згодна іншым варыянтам міфу, новы бог Вішну ў трэцім сваім увасабленьні (велічэзны дзік) апускаецца ў глыбіні першапачатковых водаў і здабывае з іх зямлю.

А зараз — беларускі міф пра стварэньне балота:

"Перш-наперш была адна толькі вада, па ёй кой-калі хадзіў Бог. Вот толькі раз ён ідзець, ажно відзіць – плывець вадзяны пузыр…"

Далей расказваецца, як лопнуў той пухір, з яго выскачыў чорт, і яны разам з богам вырашаюць стварыць зямлю, бо нязручна хадзіць па вадзе. Бог пасылае чорта у нетры вады, на дно, адкуль той прыносіць поўны "подал" зямлі, дый яшчэ яе поўна за шчокамі ў чорта. Бог раскідае прынесенае яму па вадзе. З таго і ўзялася зямля. Потым Бог загадвае, каб на гэтай зямлі расьлі дрэвы і травы. Пачынаюць яны расьці і ў чортавым роце, бо ён нічога не сказаў богу пра схаваную зямлю. І так расьпёрла чорта, што ён не стрываў і выплюнуў зямлю. "Куды толькі пляваў чорт, там і стала вадзяная зямля з дзярэўямі і травой. Дык во як балоты!.."

Гэты міф, а існуе ён у шматлікіх варыянтах, паказальны для нашай міфалогіі. Па-першае, гэта этыялагічны міф – ён тлумачыць паходжаньне зямлі, балота ў тым ліку, расьлінаў і дрэваў. Па-другое, гэта касмаганічны міф, ён структуруе менавіта нашую прастору, упарадкоўвае менавіта наш сусьвет ад яго першапачатковага хаатычнага стану. У вобразе сусьветнага Хаосу выступае першародная вада – сусьветны акіян. А вобраз пухіра, гэта аморфны стан рэчыва ў яйку ў выглядзе асобнай хтанічнай істоты, у дадзеным выпадку чорта, які нараджае свой сусьвет – балота, непасрэдна зьвязаны з іншасьветам.

Паўстаньне зямлі з вады, утаймаваньне сусьветнага патопу ці падземных водаў звычайна ўяўляюцца фактарам касьмічнага упарадкаваньня. Сама маці-зямля застаецца зьнітаванай з хаатычнымі сіламі. Паверхня зямлі хоць і зьяўляецца месцам упарадкаванай культуры, але ў сярэдзіне яе знаходзіцца царства памер-

лых, там жывуць дэманы. Апроч таго, жаночы пачатак таксама калі-нікалі асацыюецца са стыхіяй вады і з хаосам, ён звычайна стаіць на баку “прыроды”, а не “культуры”, асабліва ва ўмовах замацаванай патрыярхальнай ідэалогіі.

У сусьветных міфалогіях папулярны сюжэт касмаганічнай барацьбы са зьмеем (цмокам) у плане ўтаймаваньня вадзянога хаосу. Зьмей у большасьці міфалогіяў сэнсава зьвязаны з вадой, часьцей за ўсё, як яе выкрадальнік, ён загадвае і паводкай, і сухменем — парушэньнем меры вадзянога балансу. Паколькі космас атаясамляецца з парадкам і мерай, то хаос, натуральна, асацыюецца з парушэньнем меры.

У антычнай Грэцыі такой істоце адпавядае Гідра, ці Лернейскі Зьмей. У выяўленчым мастацтве Гідра паказана шматгаловай зьмяей, у яе можа быць ад трох да дзевяці галоў. Уяўлялі, што зьмяя, якая распласталася па зямлі, утрымлівае ваду. У Лерне гэта ўяўленьне было пашырана і трохі зьмененае ў тым сэнсе, што надыход сухменю тлумачыўся так: зьмей праглынуў ўсе воды краіны, а вось ваколіцы Лерны, дзе жыве зьмей, застаюцца *балоцістымі*. У кітайскіх міфах таксама існуе ўяўленьне, што зьмей праглынае ці зносіць з сабою ўсю ваду краіны. Наяўнасць вады (патоп, прыліў, возера, балота) залежыць ад зьмея.

У Бібліі маюцца згадкі пра барацьбу Бога з цмокам ці з дзівоснай рыбай, якая таксама сімвалізуе вадзяны хаос (Рахаб, Тэхом, Левіяфан).

Зробім высновы.

Хаосам зьяўляецца ня толькі першапачатковая вада, але і *балота*, якое прадстаўленае ў сусьветных міфалогіях такімі сімваламі, як зьмей, цмок і да т.п. Касмаганічная сімволіка балота зьвязаная і з яго рэальнымі ўласьцівасьцямі – гэта неўпарадкаваная сумесь (сумесь бяз меры) зямлі і вады, першасных элементаў, з якіх утворыцца будучы космас. Таму балота — ўлюбёнае месца бытаваньня розных нячысьцікаў, якія пераймаюць функцыі антаганіста бога ў акце стварэньня. Але гэта ўжо хрысьціянскія ўяўленьні пра Хаос і Космас. Старажытныя людзі ўспрымалі сьвет інакш. Нездарма ў нашым міфе пра паўстаньне балота, захаваліся два персанажы – бог і чорт, апошні раней таксама быў божышчам.

У беларускіх, ужо хрысьціянскіх, легендах чорт (або д’ябал) у пары з богам фігуруе як адзін са стваральнікаў сьвету, дастае зямлю з-пад вады, стварае нязручныя для чалавека ландшафты (балоты, горы, камяні), рэптыліяў, жабаў... Але далей з прычыны непаслушэнства, падману, суперніцтва, уваходзіць з богам у канфлікт, які выяўляецца ў паляваньні апошняга на чорта перунамі. Ва ўсходнеславянскіх і балцкіх фальклорных тэкстах згадваецца пра перасьлед Грымотнікам (Перуном) свайго праціўніка зьмея і падкрэсьліваецца, што апошні знаходзіцца ўнізе, ляжыць каля каранёў трохчасткавага сусьветнага дрэва, на чорнай воўне. Такім чынам, суаднясеньне чорта з каранямі дуба, як з правобразам сусьветнага дрэва, сувязь з жывёламі: ён стварае каня і ваўка, брат мядзьведзю, у кантэксце суперніцтва з богам Грымотнікам сьведчыць пра частковую асіміляцыю персанажам чорта вобраза старажытнага беларускага бога Вялеса — антаганіста Перуна.

Вядома, што раней Вялеса, адным з увасабленьняў якога быў вобраз звычайнай зьмяі, старажытныя беларусы называлі вадзяным, ці вогненым зьмеем, ці цмокам (смокам, чмокам). Пасьля прыняцьця хрысьціянства гэты вобраз дэманізаваўся і стаў звычайным чортам. Як раней казалася, чорт стварыў свой сусьвет — балота. Адпаведна гэтаму, ён і павінен у ім знаходзіцца. “Ён прабывае пастаянна ў пеклі, за дванаццацьцю дзьвярыма, на дванаццаці ланцугох”, пекла, паводле старажытных уяўленьняў беларусаў знаходзіцца пад зямлёю, у балоце. Яшчэ старажытныя беларусы лічылі, зямля — гэта скура распрасьцёртая над таўшчэзным слоем вады. У гэтай самай вадзе, на дне і месьціцца пекла. Чортава вока ці вакно, так называюць у народзе невялікія азёрцы на балотах ці глыбокія ямы на лузе. Ці не таму называюць, што нашыя продкі лічылі, быццам са свайго падземнага сьве-

ту божышча-чорт-зьмей глядзіць праз іх на людзей. У гэтыя вокны нельга было нічога кідаць і вымяраць іх глыбіню, каб не цьвяліць божышча.

На карысьць сувязі чорта з вадзяным зьмеем сьведчаць і беларускія паданьні пра імкненьне чорта загароджваць рэкі, азёры. Паводле гэтых паданьняў, вада ў рэкі і азёры трапляе праз дзіркі з-пад зямлі. Пэўна, чорту не падабаецца, што вада цячэ з ягоных уладаньняў. І тады ён загароджвае дзіркі-вытокі, завальвае раку камянямі, яны, дарэчы, таксама яго тварэньне. Спыніць раку яму не заўсёды ўдаецца, вельмі часта здараецца, што камяні прызначаныя для гэтай мэты, застаюцца на полі ці ў лесе. Такія камяні называюць чортавымі, ці зьмеевымі. У іх звычайна і жывуць чэрці, як у прасторы, якую яны стварылі. Камянёў з такімі назвамі па ўсёй Беларусі зафіксавана шмат. Этнограф XIX ст. Дземідовіч запісаў легенду пра падобны камень, які ляжаў непадалёк ад вёскі Нікольск Менскага р-ну, ва ўрочышчы Чортавіца. Нібыта гэты агромністы камень чорт нёс да Нёмана, мерыўся заваліць раку, але, на шчасьце, закрычаў певень, і чорт мусіў кінуць камень. Мясцовыя сяляне казалі, быццам чорт пакінуў на камяні сьляды кіпцюроў і адбіткі сваіх рэбраў. Пра парогі на Нёмане расказваюць, быццам на тым месцы чорт будаваў грэблю (тамаваньне), і яму засталося пакласьці апошні камень, але ў гэты час закрычаў певень (сакральная птушка, сімвалізуе Перуна). У выніку: камень застаўся незакладзеным, рака размыла ўсю грэблю, так і ўтварыліся нёманскія парогі.

У тых жа балцкіх і ўсходнеславянскіх фальклорных тэкстах пасьля пераліку аб’ектаў, дзе хаваецца зьмей (цмок), называецца і камень. У шэрагу валачобных песьняў згадваецца камень, на якім ляжыць зьмяя: “На том балотцы ляжыць камень, //На том камені ды сядзіць зьмейка”, “Ляжыць камень бялюсенькі, //Пад тым каменем — люта гадзіна”.

Паданьне пра Зьмееў камень запісаў наш вядомы этнограф і дасьледчык міфалогіі Еўдакім Раманаў. У паданьні гаворыцца, што ў вёсцы Бузер’і, што пад Лукомлем быў камень з вокнамі і дзьвярыма пад назвай Зьмееў. Жыў у тым камяні зьмей у выглядзе чалавека, і быў гэты чалавек-зьмей вельмі добрым краўцом. Варта толькі пакласьці яму ў вакенца сукно, потым грошы, а ён табе вопратку выдасьць, ды так добра пашытую, што нідзе такой ня знойдзеш. Палюбіў гэты зьмей адну мясцовую дзяўчыну, прымусіў яе жыць з ім, дзяцей у іх не было, “бо ад *іх* не бывае” (вылучана Раманавым). Прыходзіў гэты зьмей-чалавек да дзяўчыны вельмі проста, ён ператвараўся ў вясёлку (дугу) і такім чынам перапраўляўся цераз возера, таму што тая дзяўчына звычайна пасьвіла сьвіней за возерам. Вось аднойчы, калі, зьмей такім чынам прыйшоў да яе, яму захацелась спаць, ён паклаў ёй галаву на калені і папрасіў пабудзіць, ледзь толькі яна заўважыць хмары на небе. Дзяўчына, натуральна, убачыла хмары, але не пабудзіла зьмея. Калі грымнуў пярун, ускочыў у роспачы зьмей, і, перш чым ператварыцца ў дугу, пляснуў па шчацэ дзяўчыне, ад чаго ў яе на ўсё жыццё засталася пляма, потым, ператварыўшыся ў дугу, зьмей паспрабаваў перабрацца цераз возера, але другі раз грымнуў пярун, параніў зьмея, ён пасьпеў дабрацца да лесу, дзе пасьля трэцяга ўдару Перуна і сканаў. Па яго сьмерці трое сутак ішла залева. Яна скончылася толькі тады, як людзі знайшлі забітага і закапалі. Але час ад часу зьмей падымаўся ўгару, зноў пачыналася залева, людзі зноў яго шукалі, закопвалі, ужо глыбей, і дождж спыняўся.

Разгледзім гэтае паданьне дэталёва. Выгляд зьмея, згодна фальклору, нярэдка мае кравец ці шавец, які жыве ў камяні і свае вырабы аддае праз вакенца. Характэрным зьяўляецца існаваньне павер’яў, нібыта пашытыя боты і вопратку пажадана абуваць ці адзяваць на ігрышчы, але толькі не ў царкву, бо там яны адразу распадуцца на дробныя кавалкі. Гэта сьведчыць пра сувязь шаўца ці краўца з нячыстай сілай, як супрацоўніка бога, а ў больш старажытныя часы — супрацоўніка Грымотніка. Як ужо казалася раней, такіх назваў камянёў, як *камяні-краў-*

*цы* ці *камяні-шаўцы* на Беларусі зафіксавана шмат. Па легендзе ў іх звычайна жывуць чэрці, яны, як і зьмеі, шыюць вопратку ці робяць боты. У вышэй прыведзеным паданні гэта робіць зьмей – ён тут заступае чорта. Што гэта былі раней абагоўленыя постаці, якім пакланяліся як ствральніку, гаворыць пра іх стваральную сілу. Стваральнікамі прызнаюцца яны і цяпер, бо пры справе — шыюць, ствараюць рэчы з першапачатковага неаформленага палатна, ці шыюць боты з кавалкаў скуры, а гэта — стваральны акт, г. зн. праява божышча. Можна, такім чынам, дапусьціць, што раней самым першапачатковым божышчам быў, натуральна, зьмей. Тое, што зьмей ператвараецца ў вясёлку, гаворыць пра яго вогненую прыроду, прынамсі, паказвае на яго сувязь з агнём. У той жа час згодна з народнымі паданьнямі, вясёлка апускае адзін канец у мора, раку, возера ці луг і цягне ваду разам з усім, што там ёсьць. Вада падымаецца ў хмару, адкуль, як праз сіта, прасейваецца, і дождж падае на зямлю. Паводле тых жа паданьняў бог даў вясёлку дзеля таго, каб не было патопу, бо яна ведае меру вады для дажджу: пакуль яна не напампуе дастаткова вады, дождж ня пойдзе. Яшчэ ў народзе вясёлку ўспрымалі лукам Перуна, з якога грамавержац шле на зямлю стрэлы — маланкі. Тое, што пасьля забойства зьмея пайшла залева, сьведчыць пра яго вадзяную прыроду, паказвае на тое, што ён зьяўляецца ахоўнікам, ці паглынальнікам водаў. Яго прага да зямной дзяўчыны, можа быць, водгаласам чалавечых (маладых дзяўчат) ахвярапрыношваньняў. Бачна і суперніцтва зьмея з богам-грымотнікам, яго антаганістам, які адбірае ў зьмея вогненую прыроду і прымушае вярнуць на зямлю паглынутыя воды. У паданьнях, падобных гэтаму, часам канчаткова не падзеленыя сьферы ўплыву паміж двума божышчамі: Перуном і зьмеем (Вялесам), бывае не зусім ясна, хто ж на самой справе ўвасабляе вясёлку.

Даволі часта ў беларускіх легендах і паданьнях зааморфныя істоты, у выглядзе зьмея ці зьмяі, потым чорта, ператвараюцца пазьней, пры новых сацыяльных умовах у антрапаморфных. У беларускіх паданьнях зьмяя, ці чорт замяшчаюцца чараўніцамі, княгінямі, ведзьмамі, шведкамі, цыганкамі, якія, так ці інакш, затыкалі выток рэк: ці каменем, ці воўнай, ці патэльняй, ці чыгуннай юшкай, ці шчоткай. Ці проста праклiналі — рака высыхала, і ўтваралася балота. Каля Гомеля ёсьць балота пад назваю Кабылічча. У сярэдзіне XIX ст. пра яго запісана такое паданьне: калісьці тут было возера, паблізу на яго беразе жыла чарадзейка з сынам. Аднойчы здарылася няшчасьце: сын утапіўся. Маці закляла возера, і яно стала балотам. Завязала яна возера складаным замком. Каб яго адамкнуць, трэба знайсьці хлопца сямі гадоў. Ён павінен праехаць па тым балоце на кабыле трох гадоў і адшукаць месца, дзе патапіўся сын чарадзейкі. На тым месцы выраслі тры кусты чароту. Хлопец павінен іх вырваць і, не аглядаючыся, зьвезці. Тады балота зноў ператворыца ў возера.

Як бачна, зноў парушаецца водны баланс, парушаны парадак, узьнікае хаос, і робіць гэта антрапаморфны вобраз — чараўніца, у іншых паданьнях гэта ці цыганкі, ці шведы, ці французы, ці саксонцы... У народнай свядомасьці ўсе яны, пэўным чынам, далучаюцца да катэгорыі “чужых”, успрымаюцца як пасярэднікі паміж іншасьветам і людзьмі, ім надаюцца рысы маргінальнасьці, а, значыць, яны маюць кантакты з іншасьветам, у тым ліку, з яго адмоўным полюсам. Усе гэтыя вобразы выводзяцца ад жывёльнага (зааморфнага) вобраза зьмея.

Гэты зьмей ёсьць механічнае злучэньне некалькіх істотаў. Ён зьяўляецца такім жа стварэньнем, як егіпецкія сьфінксы, антычныя кентаўры. Выявы зьмея ў мастацтве даводзяць, што разам з асноўным яго выглядам: паўзун плюс птушка, ён можа складацца і з іншых жывёлаў, у яго склад уваходзіць ня толькі кракадзіл ці яшчар і птушка, але і пантэра, леў, казёл і іншыя жывёлы. Часам ён складаецца з дзьвюх, трох, чатырох жывёлаў. Цмок — зьява пазьнейшая. Гэтыя фантастычныя жывёлы — прадукт ужо гарадской культуры, калі ў людзей-носьбітаў паданьняў

губляецца непасрэдная сувязь з жывёламі. Эпоха росквіту такіх стварэньняў прыпадае на часы старажытных дзяржаваў: Егіпет, Вавілон, старажытная Індыя, Грэцыя, Кітай, дзе зьмей-цмок нават патрапіў на герб, як сімвалал дзяржаўнасьці.

Такім чынам і нараджаюцца гібрыдныя стварэньні, адным з якіх зьяўляецца цмок. Калі прызнаць, што ён створаны ў асноўным са зьмяі і птушкі, можна прыйсьці да высновы, што зьмей склаўся з жывёлаў, якія ў сусьветных міфалогіях увасабляюць душу. Хаця першапачаткова чалавек пасьля сьмерці мог ператварацца ў любую жывёлу, але калі зьявіліся ўяўленьні пра краіну памерлых, пра замагільны свет, гэтая краіна стала лакалізавацца або высока над зямлёй, або далёка за даляглядам, або, наадварот, пад зямлёю. Гэта прасочваецца па казках, у тым ліку беларускіх, дзе гаворыцца пра трыдзясятае царства. Суадносна гэтаму лімітуецца лік жывёлаў, у якіх можа ператварыцца памерлы. Для далёкіх царстваў – птушкі, для падземнага царства — зьмеі, чэрві і паўзуны. Птушка і зьмяя — самыя звычайныя, самыя распаўсюджаныя жывёлы, якія ўвасабляюць душу. У вобразе цмока яны зьліліся ў адно.

Вобраз зьмея ў беларускай міфалогіі выяўлены ў такіх персанажах, як цмок, смок, чмок. Некаторыя рысы ў гэтых вобразах таксама зьяўляюцца вынікам кантамінацыі з рысамі іншых хтанічных персанажаў. На стварэньне вобразу цмока, безумоўна, паўплывала хрысьціянская легенда пра змаганьне сьв. Георгія (сьв. Юр’я) з жахлівым цмокам, які жыў у балоце і штодня патрабаваў на зьяданьне юнакоў і дзяўчат, — сюжэт шматкроць абыгрываецца ў чарадзейных казках і баладах, і, хутчэй за ўсё, мае дахрысьціянскае паходжаньне. Узгадаем грэчаскі міф пра Персея і Андрамеду. Персей трапляе ў Эфіопію і бачыць каля мора Андрамеду, прыкутую да скалы. Маркі бог наслаў страшэнную паводку і ненажэрную акулу. Аракул абяцаў збаўленьне, калі толькі дачка цара будзе аддадзеная гэтай жудаснай рыбе. У беларускіх жа казках царэўна пасаджана ў хатку, якая знаходзіцца ці на балоце, ці ў лесе, у “пушчы-драмушчы”. Тут балота ці густы лес зьяўляюцца памежнай зонай, зонай паміж гэтым і тагасьветам, гэта уваход у іншасьвет. Узьнікае пытаньне, чаму не аднолькава ва ўсіх казках прадстаўлены іншасьвет, напрыклад, адной ракой, ці лесам, ці каранямі сусьветнага дрэва — дуба, каля падножжа якога, як вядома, месьціцца зьмей (цмок). Мяркую, гэта залежала ад месца жыхарства першабытных людзей, якія жылі на нашай тэрыторыі асобнымі групамі ці плямёнамі, былі спачатку паляўнічымі, потым земляробамі. Пры зьмене сацыяльных умоваў, узьнікае дзяржаўнасьць. Усё гэта адбіваецца, натуральна, на вераваньнях, легендах і міфах. Але самыя карані міфаў, іх першаасанова захоўваецца, і яе можна выявіць.

Вось і высьветлілася, чаму менавіта балота лічылася сакральнай зонай, зонай памежжа, уваходам у іншы, падземны сьвет. Насьпеў час распавесьці пра ахвярапрыношаньні тым божышчам, якія жылі на балотах, пра так званыя “паборы”.

Выявіць старажытныя ахвяры дапамагло само балота, дакладней, асноўная яго частка — торф. Усё, што патрапляе ў торф, кансервуецца без доступу кіслароду, гэта па сутнасьці вялікі прыродны архіў, разгадваць які ўпершыню пачалі ў паўночна-заходняй Еўропе, дзе, як вядома, меліярацыя пачалася значна раней, чым у нас. Як сьцьвярджаюць адмыслоўцы, у балотах паўночна-заходняй Еўропы знойдзена каля 700 трупаў старажытных людзей. Іх называюць яшчэ “балотнымі людзьмі”. Узрост большасьці датуецца першымі стагоддзямі нашай эры і знойдзены яны ў Даніі. Другіх адшукалі ў Паўночнай Нямеччыне, Англіі, Уэльсе, Шатландыі, Ірландыі, Нарвегіі, Швецыі і ў Цэнтральнай Еўропе.

На адной з тарфяных выспаў Борэ дацкія археолагі раскапалі вёску эпохі жалеза, у якой, на іх думку, маглі жыць “балотныя людзі”. Гэта былі традыцыйныя для раньняга жалезнага веку Ютландыі паселішчы. Будынкаў было 20, розных памераў. Яны складваліся з торфу, крыліся саломай ці верасам. Да шэрагу архе-

алагічных знаходак балота Борэ належыць яшчэ адна — Гундэструбскі кацёл. Вялікую срэбную пасудзіну знайшлі болей за сто гадоў таму. У багне Борэ кацёл апынуўся прыблізна ў той самы час, калі прорва прыняла “балотных людзей” і гэта не выпадкова. Выявілася, што кацёл меў ня толькі вялікую матэрыяльную, але й духоўную каштоўнасьць. Яго сьценкі ўпрыгожаныя шматлікімі міфалагічнымі выявамі — рэльефамі ў выглядзе рэлігійных шэсьцяў, сцэнаў ахвярапрыношаньняў, зааморфных істотаў, багоў. Скандынаўскія міфолагі знаходзяць тут выявы тых боствaў, якія карысталіся папулярнасьцю ў Ютландыі ў часы жалезнага веку. Ці не быў гэты кацёл прынесены ў якасьці ахвяры багам? Якое бoства было вартае такога каштоўнага прынашэньня?

Яшчэ ў I стагоддзі рымскі гісторык Тацыт, калі апісваў германскія плямёны, згадваў іх вярхоўную багіню — маці-зямлю Нертус. На запрэжанай быкамі калясьніцы вялікая Нертус выязджала са сьвятога гаю, абуджала сьвет і прыносіла зямлі плоднасьць. Калясьніцу і багіню, паводле Тацыта, купалі ў вадзе возера, пра месцазнаходжаньне якога ніхто з простых людзей ня ведаў. Абмываньне зьдзяйсьнялі сьпецыяльныя рабы і служкі, якіх потым тапілі ў возеры.

Дык вось, калі зьвярнуць увагу на гэтую частку запісаў Тацыта, то можна паверыць у верагоднасьць прынашэньня “балотных людзей” у якасьці ахвяраў багіні Нертус. І думка гэтая, як лічаць навукоўцы, рацыянальная. На яе карысьць існуе цэлы шэраг аргументаў. Большасьць знойдзеных трупаў мае сьляды гвалтоўнай сьмерці: звычайна ахвяраў душылі ці забівалі нажом, а ўжо потым хавалі ў балоце. Магчыма, гэты і некаторыя іншыя спосабы ўмярцьвлення людзей былі важнай часткай рытуалу складаньня ахвяраў. У страўніках “балотных людзей” захаваліся рэшткі сьпецыяльнай расьлiннай ежы, спажываньне якой незадоўга да сьмерці было, мусіць, пэўным этапам абраду. З вывучэньня вонкавага выгляду ахвяраў высьвятляюцца яшчэ некаторыя цікавыя акалічнасьці. Многія памерлыя мелі надзвычай дагледжанае цела, на іхніх руках ня бачна сьлядоў цяжкай фізічнай працы, далоні без мазалёў, пазногці падрэзаныя. Перад зьмяшчэньнем у багну чалавека звычайна галілі і распраналі. У спадарожнікі да маці-зямлі маглі патрапіць не абы якія людзі.

Цяжка сказаць пра тое, з якімі пачуцьцямі “балотныя людзі” ішлі да вялікай багіні маці-зямлі. Напэўна, яны шчыра верылі ў яе дабрадзейную моц, а таму ўвесь рытуал прынашэньня сябе ў ахвяру лічылі за шчасьце. Дрыгва прыняла іх і зрабіла неверагоднае: амаль дзьве тысячы гадоў захоўвала іх целы для нашчадкаў.

Сама маці-зямля, як было паказана вышэй, зьвязвалася ва ўяўленьні старажытных з хаатычнымі сіламі. Паверхня зямлі, як вядома, зьяўляецца месцам упарадкаванай культуры, але ў сярэдзіне зямлі знаходзіцца царства памерлых, там жывуць розныя дэманы. Апроч таго, жаночы пачатак таксама часам асацыюецца са стыхіяй вады і з хаасам, і звычайна стаіць на баку “прыроды”, а не “культуры”. У дадзеным выпадку не цалкам акрэсьлена прырода вялікай багіні маці-зямлі ў вобразе багіні Нертус. Ці зьяўляецца яна тут уладаркай ніжняга сьвету, ці верхняга? Звычайна, яшчэ з часоў палеаліту вялікая багіня маці-зямля падавалася ў выглядзе птушкі, а гэта сімвалізавала верхні сьвет. Але пераважна ўвасабленьнем абагоўленага ўладара ніжняга сьвету зьяўляўся зьмей. Перавага, якая аддавалася зьмею як вобразу мужчынскага боства зямных нетраў, грунтавалася на тым, што зьмей падаваўся яркім увасабленьнем апладняльных сілаў, паколькі нагадвае мужчынскі дзетародны орган.

Можа, у прыведзеным прыкладзе багіня Нертус выступала ў якасьці жонкі бога зямлі, бога “ніза” і сусьвету, якому акрамя іншых разнастайных ахвяраў прыносілі прыгожых дзяўчынаў, якіх папярэдне тапілі ў вадзе. Такі звычай існаваў у старажытным Егіпце, Кітаі, у майя. З іншага боку зьмей у міфах патрабуе дзяўчын у якасьці даніны — значыць, бог зямлі і вады ўяўляўся ў вобразе зьмея і мужчынскім бо-

ствам. У дадзеным выпадку, няважна, якога полу было тое боства, якімі шлюбнымі стасункамі яно было павязана з іншым боствам, цікавы сам факт прынясеньня ахвяры вадзе — боству, якое сімвалізавала сабой плоднасьць і нараджальныя сілы.

Як вядома, у Еўропе ў часы мезаліту вадзе прыносілі ў ахвяру аленяў, у Закаўказзі старажытныя могілкі месьцяцца каля рэк, у Сібіры кеты лічылі, што памерлых трэба хаваць побач з ракой. Гэты звычай можна тлумачыць як аджылае ўяўленьне пра тое, што памерлы належыць боству, якое жыло ў вадзе і выбрала памерлага ў якасьці сваёй ахвяры. У іншых народаў, месцамі і ў беларусаў, захавалася павер'е, што нельга ратаваць чалавека, які тоне, нельга забраць у боства ахвяру, якую яно сабе выбрала. Такія ж звычаі зафіксаваны і на Далёкім Усходзе, і ў неграў Афрыкі.

Як было сказана раней, на нашай тэрыторыі дасьледваньняў па ахвярапрыношаньням балотам амаль не праводзілася. Зусім выпадкова, пры распрацоўцы торфу, на Беларусі ў 1963 годзе ў балоце каля вёскі Капланавічы Клецкага раёну знойдзенае драўлянае рала раньняга жалезнага веку. Такія знаходкі ў балотах вядомыя таксама на Украіне, у Расіі, Польшы, Скандынавіі, Германіі. Знаходкі ралаў у балотах дасьледчыкі тлумачаць ахвяраваньнямі сілам вады пасьля веснавога разворваньня дзеля атрыманьня добрага ўраджаю.

Пакланеньне ў наш час сьвятым крыніцам, азёрам, рытуальныя амавеньні ў іх, ці не азначае гэта далучэньне да боства вады, боства сусьвету? Гэта боства так званага "долу" паводле паданьняў — гэта міфічны зьмей, чыёй стыхіяй была ня толькі зямля, але і зямныя воды.

У славянскіх міфах зьмей жыве ў вадзе, ахоўвае ваду, губляе сваю сілу, калі абсохне і да т. п. У беларускіх казках зьмеі і вужы зьвязаныя з дажджом. Вядомы так званыя абрады выклікаўньня дажджу. Адным з такіх абрадаў было забойства зьмяі, вужа ці жабы і вывешваньне іх скурак на дрэвах. Наогул, вуж, паводле народнай класіфікацыі, належыць да разраду гадаў і, як гад, уяўляе сабой мужчынскі персанаж міфалагічных паданьняў. У пару "гаду" існавала "гадыня" — так называлі гадзюку, напрыклад, у Мядзельскім раёне. Беларускія міфалагічныя паданьні падкрэсьліваюць асаблівую архаічнасьць вераваньняў нашых продкаў, у іх расказваецца, што некалі людзі трымалі вужоў у хатах у падпечку. Калі наступала пара палуднаваць і карміць дзяцей, у вялікіх сем'ях дзяцей кармілі асобна ад дарослых, пасадзіўшы іх на падлозе вакол вялікай міскі са стравою. Вось тады вуж сьмела выпаўзаў са свайго сховішча і еў разам з дзецьмі. Калі вуж жыў у хляве, то яму дазвалялі частавацца малаком каровы, непасрэдна з вымені. Такога даільшчыка забаранялася турбаваць і забіваць без паважнай на тое прычыны. Такою прычынай, як сказана вышэй, мог стаць сухмень.

Арыэль Голан у сваёй кнізе "Міф і сімвал" сьцьвярджае, што дождж і зьмяя узаемазьвязаныя ў міфалогіі старажытных майя, у павер'ях паўночна-амерыканскіх індзейцаў. У старажытных грэкаў ёсьць такі міфалагічны персанаж, як трохгаловы зьмей Трытон. З ім нават зьвязаны гідронімы: возера *Tritonis*, рака *Triton*. У Рыгведзе *Trita* — бог вады. Арфей (*Orpheus*) — сын ракі, яго імя вытворнае ад *orphis* "*зямля*". У Рыгведзе Індра завецца "*бык*", г.зн. бог зямлі, які падняўся з мора. У ліку індаеўрапейскіх назваў мора гучыць імя неалітычнага бога зямлі — хетскага *aruna*, санкрытскае *arna* параўноўваецца з *Уран*, *Варуна*, а праіндаеўрапейскае "*mar, mor*" і "*мора, возера, балота*" таксама ўзаемазьвязаныя паміж сабой каранямі *m.r.* У індзейцаў Перу вышэйшы бог Варакоча, на статуэтцы якога ёсьць выява зьмеяў, таксама падняўся з возера. У старажытных грэкаў ушаноўваўся бог Тыфон, з якім змагаўся Зеўс. Атрыбут гэтага бога-зьмея ў выглядзе яйкападобнага каменя захоўваецца ў Дэльфійскім храме. У кітайскай міфалогіі самым першасным богам лічыўся зьмей. У старажытных габрэяў-паганцаў было боства па імені *Гад* (*Gad*), у старажытных сірыйцаў *Gado* — хатні дух у выглядзе зьмея, які дарue

дабрабыт і багацьце (узгадайце нашых вужоў-дамавікоў). Бог падземнага сьвету (*пекла* па-нашаму) ў Ханаане быў Ваал, які зваўся яшчэ і *Ваал-Гад*. *Hades* — імя грэчаскага бога падземнага сьвету.

Міфы падаюць і жаночы вобраз зьмяі, напрыклад кітайская Нгой-ва, прарадзіцелька чалавецтва ў выглядзе паўжанчыны паўзьмяі, ці грэчаская Яхідна, дзевазьмяя. У некаторых міфалогіях сьвет разьмешчаны на сьпіне лягушкі (жабы). Ёсьць павер'е, нібыта кваканьне жабак прадказвае дождж. У славянскіх казках лягушка параўноваецца са зьмяёй, лягушку абагаўлялі ў старажытным Егіпце, а ў Дагестане забіць лягушку лічылася сур'ёзным грахом. У Літве сустракаюцца надмагільныя помнікі з выявай лягушкі. У адным са старaславянскіх апокрыфаў д'ябал, калі спакушае Еву, прымае аблічча лягушкі, а не зьмея. У выніку робіцца зразумелым — лягушка, зьвязаная з тым жа боствам, што і зьмяя, у міфалагічнай сьвядомасці яна таксама валодае рысамі, якія прыпісваюць зьмяі — стварэньню хтанічнаму, злавеснаму, мудраму. Яна валодае дарам прароцтва, яе, як і зьмяю, лічаць апякункай жытла. Лягушка шмат у якіх народаў лічыцца сімвалам урадлівасьці. Палякі ўяўлялі жаночы орган, матку, у выглядзе жабы, якая сваімі лапамі сьціскае вантробы.

Са старажытных часоў жабы прыцягвалі да сябе ўвагу людзей здольнасьцю да поўнай трансфармацыі: ад ікрынкі праз апалоніка да свайго канчатковага выгляду. Таму ў казачных эпасах Заходняй і Усходняй Еўропы быў надзвычай пашыраны сюжэт пра ператварэньні жабы ў прынца альбо ў царэўну. Яскравы прыклад гэтаму — усходнеславянскі казачны сюжэт пра "царэўну-жабу". У гэтай казцы таксама пра жаніцьбу царскага сына на царэўне-жабцы, якая робіць яго спадкаемцам бацькавага царства — Царом. Але, калі царэвіч не выконвае забароны царэўны і спальвае яе скурку, яна вымушана пакінуць яго у абліччы лебедзі, т.зв. зьмеегаловай птушкі і зьлятае да свайго бацькі. Далей царэвіч даведваецца, што яго жонка "хітрэйшая-мудрэйшая за свайго бацьку ўрадзілася, ён за тое ўсердзіўся на яе і загадаў ёй тры гады жабаю быць". Яе бацькам, дарэчы, у казках заўсёдна зьяўляецца "Кашчэй Бессьмяротны", які падаецца ў чарадзейнай казцы ў вобразе антаганіста галоўнаму герою і ахоўвае іншасьвет, ці зьяўляецца яго гаспадаром. Другія казкі пра Кашчэя стасуюцца з папулярным у індаеўрапейцаў міфам пра вяртаньне плоднасьці на зямлю. Да прыкладу — ведыйскі міф пра выкраданьне дэманічным зьмеем Ваалай статкаў свойскай жывёлы і водаў, далей у міфе гаворыцца пра перамогу бога-грымотніка Індры над зьмеем. Яшчэ Кашчэй можа выкрасьці красуню-дзяўчыну, якая апынаецца разам з ім у падземным царстве, пасьля чаго з зямлі зьнікае плоднасьць. Галоўны герой выратоўвае красуню, ён здабывае кашчэеву сьмерць, схаваную ў яйку, што знаходзіцца ў качцы, качка ў зайцы, заяц у куфры, а куфар — менавіта на вершаліне сусьветнага дрэва — на дубе. Калі верхняя частка дуба сімвалізуе сьвет вечнасьці, то яго карані адпавядаюць зоне існаваньня продкаў, зоне хтанічнага сьвету. Менавіта каля каранёў сусьветнага дрэва знаходзіцца ўваход у трыдзевятае царства — царства сьмерці. Пасьля вызваленьня прыгажуня з гэтага царства становіцца жонкай галоўнага героя, а на зямлю вяртаюцца плоднасьць і дабрабыт.

Калі ўжо згаданы казачны Кашчэй, то нельга абысьці ўвагай і матыў казачнай Бабы Ягі, якая "на ступе едзе, таўкачом паганяе". Вобраз Бабы Ягі без сумневу архаічны і глыбокі. Яе амбівалентнасьць выяўляецца ў тым, што яна, і як першапродак, і як першанябожчык кіруе ініцыяцыяй героя, ён ў яе хатцы перараджаецца для новага жыцьця. Таму і славутая хатка на курыных лапках ўспрымаецца ня толькі як месца сьмерці, але і як калыска новага жыцьця, улоньне маці. Фактычна, ступа выступае як сімвалічны эквівалент хаткі. Некаторыя навукоўцы на падставе лінгвістычных дадзеных удакладнілі міфалагічны і казачны прататып Бабы Ягі ў вобразе зьмяі, бо зьмяя "аднаногая", як і Баба Яга, мае хтанічны ха-

рактар, а таму мае дачыненьне да царства памерлых. Такі элемент як -яга і яго варыянты, магчыма, зьнітаваныя з індаеўрапейскім коранем “egh(i) “зьмяя”. Іншыя навукоўцы сьхіляюцца да думкі, што Баба Яга мела выгляд птушкі, бо хатка яе мае курыныя лапкі, а вочы самой Бабы Ягі, як у птушкі — разьмешчаны з бакоў галавы, нос даўгі. У адной з казак царыца над усімі птушкамі ператвараецца ў дзяўчыну і выходзіць замуж за героя. У яе ёсьць яшчэ дзьве сястры, дзьве Бабы Ягі, якія жывуць у лесе. Гэта сьведчыць, што вобраз Бабы Ягі вельмі старажытны і ўвасабляе нейкае архаічнае боства, якое бярэ шлюб з героем і дапамагае яму.

Якая ж сувязь вобразаў Бабы Ягі і Кашчэя са сьмерцю? Дзеля гэтага варта разгледзець такую зьяву, як абрад пасьвячэньня хлопцаў пры дасягненьні імі полавой сталасьці. Абрад настолькі шчыльна зьвязаны з уяўленьнямі пра сьмерць, што яны адзін без другога не ўспрымаюцца. Пра гэта пераканаўча сьведчаць казкі. Аднак, казкі пазьнейшыя, вытворныя ад міфаў, таму спасылкі на іх дапушчальныя толькі пры адсутнасьці першакрыніцаў. Існуе тэорыя, згодна з якой ў час пасьвячэньня з пасьвячаемага вымалася душа і перадавалася татэмнай жывёле. Вядома, што ў этнаграфічных матэрыялах няма доказаў гэтай тэорыі, і вядомы дасьледчык міфалогіі Фрэзер у сваёй кнізе “Залатая галіна” спасылаецца на казачнага Кашчэя. І сапраўды, душа Кашчэя захоўваецца па-за целам.

Наконт абраду пасьвячэння вядома, што пры дасягненьні хлопцам полавой сталасьці, ён уводзіўся ў родавае аб’яднаньне, рабіўся паўнапраўным яго чальцом і набываў права браць шлюб. Такая сацыяльная функцыя ў гэтага абраду. Уяўлялася, што хлопец падчас абраду памірае, а затым зноў уваскрасае, але ўжо новым чалавекам. Гэта — так званая часовая сьмерць. Сьмерць і ўваскрашэньне імітаваліся дзеяньнямі, што адлюстроўвалі паглынаньне хлопца пачварнай жывёлай. Хлопец нібыта праглынаўся ёй і праз некаторы час вяртаўся на сьвет са страўніку пачвары. Для зьдзяйсненьня гэтага абраду часам будаваліся адмысловыя хаткі, паветкі, якія нагадвалі абрысамі жывёлаў, а ўваход уяўляўся пашчай, пасткай. Тады ж праводзілася і абразаньне. Абрад гэты заўсёды рабіўся у лесе, ці ў іншым глухім месцы, накшталт балота, якое выступала і як памежнае месца, і як месца жыхарства той самай жывёлы-боства, якое ахоўвае ўваход ў царства памерлых. Усё гэта рабілася ў вялікай таямніцы. Абрад суправаджаўся цялеснымі пакараньнямі і пашкоджаньнямі (адсяканьнем пальца, выбіваньнем пэўных зубоў і інш.). Другая форма часовай сьмерці выяўлялася ў тым, што хлопчыка сімвалічна спальвалі, варылі, смажылі, секлі на кавалкі і зноў уваскрашалі. Уваскрослы атрымліваў новае імя, на скуру ставілася кляймо ці іншыя адзнакі пройдзенага абраду. У час ініцыяцыі хлопчыка абвучалі паляваньню, яму паведамляліся некаторыя таямніцы рэлігійнага характару, гістарычныя зьвесткі, побытавыя правілы, патрабаваньні і да т.п.

У казках герой ці гераіня звычайна патрапляюць у лес. Цёмны драмучы лес, пушча-драмушча — гэта зона Бабы Ягі, гэта ўваход у царства памерлых. У лесе герой бачыць хацінку на курыных лапах, якая круціцца. Дзьверы ў хатцы скіраваныя да трыдзесятага царства, глухая сьцяна — да звычайнага сьвету. Герой ня можа абыйсьці гэтую хатку і ён яе перакручвае. Хатка знаходзіцца пад аховай, за яе межы герой патрапіць толькі тады, як пройдзе выпрабаваньне. Часам хатка стаіць на беразе мора ці ракі, часам — каля балота ці канавы, якую трэба пераскочыць. Баба Яга сядзіць у хатцы, яна ахоўніца царства памерлых. Хатка — жытло сьмерці, і ўваход у яе з боку сьмерці. У старажытнай Скандынавіі дзьверы ў дамах ніколі не рабіліся з паўночнага боку, гэты бок лічыўся нешчаслівым, і, суадносна, у Эдзе (Настранд) жытло сьмерці мае дзьверы з паўночнага боку.

У амерыканскіх паляўнічых міфах, каб патрапіць у хатку, трэба ведаць імёны яе частак. У іх хатка захавала больш заўважных сьлядоў зааморфнасьці, часам замест хаткі нават фігуруе жывёла. Герой ці прамаўляе магічныя словы, якія адчыняюць яму ўваход у царства памерлых, ці ахвяруе чым-небудзь. Далей у гэтай

хатцы адбывалася абразаньне неафіта. Паступова хата-зьвер губляе свой жывёльны выгляд. Найдолей захоўваюць ранейшы вобраз дзьверы, яны ўяўляюцца, як пастка, пашча.

Такім чынам, дзеля абраду ініцыяцыі будавалі хатку ў выглядзе жывёліны. У гэтым абрадзе пасьвячаемы трапляў у сферу сьмерці праз яе дзьверы. У міфах ужо губляецца зааморфны характар хаткі, але дзьверы, як і ў беларускіх казках слупы (курыныя лапы) захоўваюць зааморфны выгляд. Прыведзены абрад створаны родавым ладам і адлюстроўвае паляўнічыя інтарэсы і ўяўленьні.

Але варта вярнуцца да вобразу вялікай багіні-маці, ці да вобразу гаспадара іншасьвету, гаспадара падземных водаў, да іхніх ахвяраў, у прыватнасьці тых, якія апісваліся вышэй, калі гаварылася пра балотных людзей, знойдзеных у балотах паўночна-заходняй Еўропы.

Такім чынам, незалежна ад полу гэтага боства, яму складаліся ахвяры, яго паважалі, яму пакланяліся, яго баяліся. Гэта было магутнае боства, гаспадар падземнага сьвету, сусьветных водаў, у нашым выпадку — старажытны бог Вялес, увасабленьнямі якога зьяўляюцца вадзяны ці вогнены зьмей, цмок ці чорт, ён быў гаспадаром нашых рэк, вазёр, балот, крыніц. Пасьля прыходу хрысьціянства гэтае боства ператварылася ў колькі дэманізаваных боствау-духаў.

Гэта найперш Балотнік, які жыве ў звычайным балоце, народнае уяўленьне прыпісвае яму нядобры характар і неахайны выгляд, за ім Багнік, ён жыве ў тарфяным балоце. Такое балота не пакрытае расьліннасьцю і ўяўляе чорную брудную лужыну з атрутнымі газамі, якімі багнік забівае свае ахвяры. Далей ідзе Аржавень (Аржавеньнік) брудна-руды, з неверагодна вялікім жыватом і тонкімі, як саламінкі, нагамі. Ён увесь час рыгае, і ўсе жывыя істоты абыходзяць яго бокам. Самы ж галоўны злыдух, які жыве ў самым багністым балоце, і якому падпарадкоўваюцца ўсе ніжэйшыя злыя духі, Кадук. Ён рэдка выходзіць са свайго балота і займаецца шматлікімі распараджэньнямі і распраўамі, выдумляе, якую шкоду рабіць супраць людзей. Ёсьць у беларусаў яшчэ лясны бажок Лазавік. Ён жыве ў лазе на балоце, у маленькім дамку без дзьвярэй і вокнаў, з адтулінай у страсе. Вочкі яго бліскаюць, як агеньчыкі ў цемры. А жытлом для чарцянятаў Лозьнікаў служаць густыя кусты пераплеценага лазьняку. Гэтыя істоты зусім ня злосныя, але шкадлівыя. Вось прыклад перасьцярогі гарэзьлівым дзецям: “Не хадзіце далёка ад дома — Хапун ухопіць, пасадзіць у торбу і панясе за цёмны лес. А за цёмным лесам — балота, пасярод балота — стары корч, пад тым карчом — нара. Там і жыве Хапун”. Далей расказваецца, як Хапун зьдзекуецца з непаслухмяных дзетак, б’е іх крапівой. І ніхто ўжо гэтых дзяцей ня знойдзе, бо ніхто не даходзіў да жытла нячысьціка. Гэта што тычыцца мужскіх персаналіяў. А ёсьць яшчэ і жаночы дух — Лойма. “Лоймамі называюць у нас людзі злых духаў, толькі ў бабскай постаці. Яны знойдуцца найбольш у балоце, у лазе і страшаць бабаў, хоць часам і да мужчынаў прывяжуюцца. У Лоймы вечна раскудлачаныя косы і наверху цыцкі вялікія вісяць, а сама страшная” (Федароўскі).

Калі ўяўвіць сабе, што гэты персанаж мог быць вялікай багіняй, то паўстае пытанне: няўжо ж гэтая вартая жалю істота магла быць калі-небудзь вярхоўнай багіняй кшталту маці-зямлі? А намаляваныя вышэй духі-нячысьцікі былі некалі ўсемагутнымі гаспадарамі падземных водаў і трыдзесятага царства? Няўжо беларусы так здзекуюцца са сваіх старажытных багоў? Яны ж пакланяліся ім не адно тысячагоддзе і складалі ахвяры ў сакральных месцах, дзе, паводле іх уяўленьняў, жылі тыя боствы. Можа, гэта таму, што яны больш баяліся, чым паважалі іх? Вядома ж, людзі, сьмеючыся, разьвітваюцца са сваім мінулым, са сваімі былымі страхамі. Можа быць. Але нязьменна адно: адметнасьць нашага ланшафту адыграла немалую ролю ў нашым сьветаўспрыманьні, у міфа-паэтычнай карціне пабудовы менавіта нашага сьвету. Наш народ працягвае ўшаноўваць такія сакраль-

ныя мясьціны, як сьвятыя крыніцы, азёры і балаты. Пра гэтыя мясьціны і боствы, якім раней пакланяліся, засталіся прыгожыя легенды і паданьні, яны і сёньня хвалююць і натхняюць мастакоў, пісьменнікаў, даюць падставы для развагаў.

Яшчэ трэба памятаць, што ў нашых балотах жыве наш цмок ці чмок. Ну і што, калі ў яго ня вераць, калі яго пераасэнсавалі ў непрыгожых пачварных істотах. Гэта зусім не азначае, што яго няма, нібыта ён памёр. Ён проста сьпіць, чакае свайго часу. Ад яго, як і раней, залежыць – быць ці ня быць вадзе на зямлі. Так ці інакш, трэба берагчы прыгожы белы край балотаў, сваю Беларусь. Не асушваць і не зьнішчаць без дай прычыны цудоўныя вільготныя мясьціны. Іначай, у якасьці ахвяр нам давядзецца заплаціць пазбаўленьнем кіслароду і нарошчваньнем утрыманьня ў атмасферы вуглякіслага газу. Мы можам пазбыцца азёраў і рэк, утвораных праз балаты, цудоўных лекавых расьлінаў, што растуць на балотах і шмат чаго яшчэ. Таму лепш не турбаваць заснулага цмока...

На заканчэньне прыгадаю рандо Максіма Багдановіча, які бачыў у балоце асаблівыя чары і прыгажосьць:

Узор прыгожых пекных зор<br>
Гарыць у цемні небасхіла;<br>
Вада балот, стаўкоў, азёр<br>
*Яго ў глыбі сваёй адбіла.*